# Р А З Д Е Л 5
# ВНЕШНЯЯ ПОЛИТИКА И ДИПЛОМАТИЯ БЕЛАРУСИ (1918–2020 гг.)

## ПРАБЛЕМА БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ УЗАЕМААДНОСІН 1915–1924 гг. У АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 2000-х гг.

***С.В. Багалейша (Мінск)***

Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1915–1924 гг. недастаткова і фрагментарна адлюстраваны ў айчыннай гістарыяграфіі 1990–2000-х гг. Ёсць кнігі і артыкулы, у якіх ў той ці іншай ступені асвятляюцца асобныя аспекты абазначанай праблемы. Шмат якія пытанні гэтай тэмы ўвогуле выпалі з поля зроку гісторыкаў. Сітуацыя з вывучэннем беларуска-літоўскіх узаемаадносін ўскладнялася яшчэ і тым, што многія матэрыялы маладаступныя для беларускіх даследчыкаў, бо знаходзяцца ў архівах Польшчы і Літвы. Аўтар у гэтым артыкуле паставіў перад сабой задачу зрабіць короткі агляд айчыннай гістарыяграфіі па праблеме беларуска-літоўскіх узаемаадносін у 1915–1924 гг. перыяду 2000-х гг.

На мяжы 1990-х – 2000-х гг. пытаннямі нацыянальнага руху, дзейнасцю беларускіх нацыянальных партый і арганізацый, узаемаадносінамі з іншымі краінамі займаліся прафесійныя гісторыкі-даследчыкі. Яны зыходзілі з новых пазіцый, уводзілі ў навуковы зварот раней невядомыя факты і матэрыялы, многія з якіх былі надрукаваны на старонках перыядычнага друку Перш за ўсё, трэба назваць навуковыя публікацыі П. Брыгадзіна і У. Ладысева [4; 12], В. Мазеца [13], Р. Платонава і М. Сташкевіча [18], В. Круталевіча [11]. У іх артыкулах ёсць некаторыя звесткі пра дзейнасць Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе; аналізіруецца дзейнасць Рады БНР на міжнароднай арэне па ўсталяванні знешнепалітычных адносін з іншымі краінамі, у тым ліку і з Літвой.

У даследчыкаў вялікую цікавасць выклікалі праблемы пошуку форм адраджэння беларускай дзяржаўнасці, канцэпцыі і праекты, якія існавалі ў пачатку XX ст. на гэты конт. У даследваннях А. Багдановіч [2], А. Ціхамірава [25] і інш. ёсць асобныя ўпамінанні пра ідэі стварэння беларуска-літоўскай дзяржавы ў форме Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага і Злучаных Штатаў ад Балтыйскага да Чорнага мора. Цікавым з'яўляецца артыкул С. Марозава "Правал Канфедэрацыі ВКЛ 1915 г. – лёс або заканамернасць?" [15], у якім аўтар прапануе свой пункт гледжання на дадзенае пытанне.

Некаторыя аспекты развіцця беларускага нацыянальнага руху на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны, дзейнасць беларускіх партый і арганізацый і іх ролю ў пашырэнні ідэі беларус-

Рэпазіторый БГУ

кай дзяржаўнасці даследавалі В. Пятроў [17], А. Цобкала [26], М. Шчаўлінскі [30], М. Цуба [27], А. Райчонак [19], С. Сільвановіч [21], С. Рудовіч [20] і інш. У сваіх працах яны разгледзелі асобныя аспекты распрацоўкі першых планаў утварэння беларускай дзяржаўнасці ў форме Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага і Злучаных Штатаў ад Балтыйскага да Чорнага мора; прывялі факты, якія сведчаць аб выхадзе беларускіх нацыянальных дзеячаў на міжнародную арэну; прааналізавалі асноўныя напрамкі развіцця беларускага руху пад час Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. У публікацыях А. Грыцкевіча [7], А. Ціхамірава [25], С. Хоміча [28]. даюцца звесткі, якія раскрываюць палітычную дзейнасць паміж урадам БНР і Літоўскай Тарыбай; аналізуюцца дагаворы аб супрацоўніцтве ад 27 лістапада 1918 г. і 11 лістапада 1920 г.

Вельмі слаба даследаванымі з'яўляюцца савецка-літоўскі мірны дагавор ад 12 ліпеня 1920 г, дзейнасць Міністэрства беларускіх спраў пры літоўскім урадзе, дзейнасць беларуска-літоўскіх ваенных фарміраванняў. Невялікія звесткі па гэтых пытаннях утрымліваюцца ў артыкулах У. Міхнюка [16], У. Ладысева [12], П. Брыгадзіна [4], манаграфіях А. Ціхамірава [25] і В. Круталевіча [11].

Вывучэннем праблем польска-літоўскага канфлікту, сюжэтаў, звязаных з гісторыяй Сярэдняй Літвы, адносін Рады БНР да віленскага канфлікту займаліся І. Коўкель [10], М. Іваноў [9], А. Чарнякевіч [299] і інш. У сярэдзіне 2000-х гг. з'явіліся артыкулы маладых навукоўцаў, якіх зацікавілі праблемы польска-літоўскага канфлікту і роля ў ім буйных заходнееўрапейскіх краін – Францыі і Англіі, гісторыя Сярэдняй Літвы. Фрагментарна ў артыкулах разглядаецца і пазіцыя беларускіх нацыянальных дзеячаў падчас канфлікту. Гэта артыкулы А. Дуброўкі [8], В. Ашарчука [1], М. Стральца [23], А. Горнага [6]. Праблему краёвасці ў нацыянальнай ідэі польскага руху на беларускіх і літоўскіх землях на старонках сваіх артыкулаў уздымае А. Смалянчук [22].

Цікавасць гісторыкаў прыцягвае і Літоўска-Беларуская ССР – адна са старонак у гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Гісторыя ЛітБел ССР і месца гэтага дзяржаўнага ўтварэння ў айчыннай гісторыі да сённяшнягя часу выклікае дыскусіі сярод гісторыкаў. Да важных пытанняў гісторыі Літоўска-Беларускай ССР, якія працяглы час заставаліся спрэчнымі ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі, адносяцца такія аспекты, як перыяд існавання ЛітБел і час яе ўтварэння, прычыны ліквідацыі аб'яднанай рэспублікі, блытаніна ў пытаннях аб складзе тэрыторыі, памерах плошчы і колькасці насельніцтва. Дадзеныя, якія ўзгадваюцца ў навуковай літаратуры, вельмі розняцца паміж сабою, а ў асобных выпадках з'яўляюцца ўзаемавыключнымі. Калі ў савецкай гістарыяграфіі утварэнне ЛітБел трактавалася як рэалізацыя на практыцы бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі, то сучасныя гісторыкі па іншаму разглядаюць і прычыны ўтварэння, і характар гэтага дзяржаўнага ўтварэння, засяроджваюць сваю ўвагу на знешнепалітычных і ўнутрыпалітычных фактарах.

Репозиторий ВГУ

Гэтыя пытанні ў сваіх манаграфіях, навуковых артыкулах уздываюць такія даследчыкія як В. Круталевіч [11], Л. Малыхіна і У. Міхнюк [14], С. Хоміч [28], А. Ціхаміраў [25], В. Талкачоў [24] і інш.

Падыходы да асвятлення характару Літоўска-Беларускай рэспублікі таксама розняцца. Частка даследчыкаў разглядаюць ЛітБел як штучнае ўтварэнне, называюць яго надуманым і нежыццяздольным [16]. У некаторых публікацыях выказваецца думка аб тым, што Літоўска-Беларуская ССР не была створана як дзяржава, не быў створаны дзяржаўны апарат і мясцовыя органы ўлады [14]. Але і сёння не ўсе пытанні даследаваны ў дастатковай ступені, ў першую чаргу ўнутраная палітыка, сацыяльна-энамамічныя і нацыянальна-культурныя пераўтварэнні, арганізацыя беларуска-літоўскай арміі.

У 2011 г. Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі выдаў кнігу першую фундаментальнага даследавання "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст." [5], у якім значнае месца адведзена асвятленню беларускага нацыянальнага руху падчас Першай сусветнай вайны, разглядаецца праект адраджэння беларуска-літоўскай дзяржаўнасці ў форме Канфедэрацыі ВКЛ, адносіны да яго розных палітычных колаў. Шмат ўвагі таксама надаецца аналізу праблем утварэння і развіцця Літоўска-Беларускай ССР.

У 2014 г выйшла манаграфія С. Багалейша "Белаларуска-літоўскія ўзаемаадносін у 1915–1924 гг.", у якой аўтар на падставе шырокага кола гістарычных крыніц, у тым ліку і архіўных, зрабіла спробу ўсебакова разгледзець розныя аспекты дадзенай праблемы. Аўтарам выяўлены важнейшыя асаблівасці гэтага працэсу, формы і шляхі беларуска-літоўскага супрацоўніцтва ў акрэслены перыяд ад першых праектаў стварэння беларуска-літоўскай дзяржавы да згортвання супрацоўніцтва ў 1924 г., з улікам вырашэння на карысць Польшчы польска-літоўскага канфлікту 1920–1922 гг. Важнае месца ў даследванні займае аналіз прычын утварэння, дзейнасць Літоўска-Беларускай ССР і роля гэтага дзяржаўнага ўтварэння ў агульнай беларуска-літоўскай гісторыі. Зыходзячы з усяго раней сказанага, аўтар даследавання зрабіла спробу грунтоўнага і ўсебаковага аналізу гэтых праблем, што дазволіць стварыць аб'ектыўную карціну развіцця беларуска-літоўскіх узаемаадносін [3].

Такім чынам, аналіз гістарыяграфіі праблемы беларуска-літоўскіх узаемаадносін у 2000-х гг. паказвае, што розныя аспекты дадзенай праблемы ў перыяд станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці ў Беларусі і ў Літве вывучаліся беларускімі гісторыкамі, але адзіных поглядаў на дадзеную праблему не склалася. Усё вышэй прыведзенае дазваляе гаварыць, што гэтыя сюжэты патрабуюць больш глыбокай навуковай характарыстыкі, у тым ліку з выяўленнем і прыцягненнем новых гістарычных крыніц, якія знаходзяцца ў рэспубліканскіх і замежных архівах, а таксама тых, якія ўжо надрукаваны.

Репозиторий ВГУ

*Крыніцы і літаратура:*

1. Ашарчук, В.А. Віленскае пытанне: праблема дзяржаўнай прыналежнасці Віленскага краю ў міжнародных адносінах (1918–1921 гг.) / В.А. Ашарчук // Беларуская Думка. – 2009. – № 12. – С. 154–159; Ашарчук, В. А. Белорусский фактор политической борьбы вокруг Срединной Литвы в октябре 1920 г. – январе 1922 г. / В.А. Ашарчук // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны : зборнік навуковых артыкулаў / Установа адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны". – Гомель, 2012. – Вып. 1. – С. 310–315.

2. Багдановіч, А.Г. Праблема нацыянальнай дзяржаўнсці ў грамадска-палітычным руху Беларусі (сакавік 1917 – студзень 1919 гг.): аўтарэф. дыс. на атрым. вучон. ступ. канд. гіст. навук: 07.00.01 / А.Г. Багдановіч. – Мн., 1995. – 19 с.

3. Багалейша, С.В. Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1915–1924 гг. / С.В. Багалейша. – Мінск : БДАТУ, 2014. – 232 с.

4. Брыгадзін, П.І. "Іменем беларускага народу…" / П.І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 2. – С. 25–31.

5. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пач. XXI ст. / А.А. Каваленя [і інш.]; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мн, 2011. – Кн.1. – 583 с.

6. Горны, А.С. Беларуская паланафільская арганізацыя "Краёвая сувязь" у грамадска-палітычным жыцці Сярэдняй Літвы (1921–1922 гг.) / А.С. Горны// Гуманітарна-эканамічны веснік : навукова-тэарэтычны часопіс. – 2014. – № 2. – С. 36–42.

7. Грыцкевіч, А. Беларуска-літоўскія дачыненні / А. Грыцкевіч // Спадчына. – 1994. – № 5. – С. 58–63.

8. Дубровко, Е.Н. Великобритания и проблема польско-литовского размежевания в декабре 1919 г. – октябре 1920 г. / Е.Н. Дубровко // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальных і міждзяржаўных адносін: зборнік навуковых артыкулаў / ГДУ імя Ф. Скарыны. – Гомель, 2012. – Вып. 1. – С. 305–310.

9. Іваноў, М. Сярэдняя Літва / М. Іваноў // Літаратура і мастацтва. – 1995. – 1, 8, 15 верасня.

10. Коўкель, І. Польска-літоўскі канфлікт і роля ў ім беларускіх партый і арганізацый (1920–1923 гг.) / І. Коўкель // Беларусіка-Albarutenika. – Мн, 1994. – Кн. 3. – С. 261–269.; Коўкель, І.І. "Беларускае пытанне " ў палітыцы Польшчы (1918–1920) / І.І. Коўкель // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь. Новыя канцэпцыі і падыходы : Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў. Мінск, 3–5 лютага 1993 г.: у 2-х ч. – Мн., 1994. – Ч. 1. – С. 150–161.

11. Круталевич, В.А. История Беларуси: Становление национальной државности (1917–1922 гг.) / В.А. Круталевич. – 2-е изд., доп. – Мн. : Право и экономика, / 2003. – 592 с.; Круталевич, В.А. На путях самоопределения: БНР-БССР-РБ / В.А. Круталевич. – Мн.: Право и экономика, 1995. – 138 с.

12. Ладысеў, У.Ф. Міністэрства Беларускіх Спраў. Праблема беларуска-літоўскага супрацоўніцтва ў 20-х гадах / У.Ф. Ладысеў // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў РБ: і перспектывы развіцця. Матэрыялы 2-й Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў. Мінск, 10–11 красавіка 1997 г. – Мн, 1999. – С. 134–136.; Ладысеў, У.Ф. Міністэрства Беларускіх Спраў / У.Ф. Ладысеў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 5. – С. 145.; Ладысеў, У. Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У.Ф. Ладысёў, П.І. Брыгадзін – Мн. : БДУ 2003. – 307 с.

13. Мазец, В.Г. Межы БНР / В.Г. Мазец // Спадчына. – 1993. – № 2. – С. 106–111.; Мазец, В.Г. Беларускі нацыянальны рух ад снежня 1917 да лютага 1918 г. / В.Г. Мазец // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX ст. (Зб. навук. арт.) – Мн., 1998. – С. 344–345.

Репозиторий ВГУ

14. Малыхіна, Л.Ю. Гістарыяграфія Літоўска-Беларускай ССР / Л.Ю. Малыхіна, У.М. Міхнюк. – Брэст : Выдавецтва БДТУ, 2005 – 119 с.; Малыхіна, Л.Ю. Прычыны абвяшчэння Літоўска-Беларускай ССР (гістарыяграфія праблемы) / Л.Ю. Малыхіна // Белорусский журнал международного права и международных отношений. – 2003. – № 4. – С. 64–68.
15. Марозаў, С. Правал канфедэрацыі ВКЛ – лёс або заканамернасць / С. Марозаў // Шляхі да ўзаемнасці / рэдкалегія: І. Крэнь (адказны рэдактар) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2009 – С. 265–269.
16. Міхнюк, У. Расійска-літоўскі дагавор 12 ліпеня 1920 г.: гістарыяграфія праблемы / У. Міхнюк // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 8. – С. 3–11.
17. Петров, В.Н. Деятельность белорусских общественно-политических организаций во время немецкой оккупации (1915–1917) / В.Н. Петров // Пытанні гісторыі і методыкі выкладання. Зборнік навуковых артыкулаў. – Мн., 1998. – Вып. 1. – С. 47–50.
18. Платонаў, Р. Так вырашаўся лёс Беларусі. З гісторыі барацьбы палітычных партый за беларускую дзяржаўнасць у 20-я гг. / Р. Платонаў, М. Сташкевіч // Маладосць. – 1993. – №. 4. – С. 194–205. – 1993. – №.5. – С. 199–214.; Платонов, Р. Тернистый путь к свободе: К вопросу о становлении белорусской национальной государственности / Р. Платонов, Н. Сташкевич // Нёман. – 1992. – № 10. – С. 129–155.
19. Райчонак, А.А. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі напярэдадні і ў час Першай расійскай рэвалюцыі / А.А. Райчонак // Труды БГТУ : научный журнал – 2012. – № 5. – С. 35–37; Райчонак, А.А. Уплыў Першай сусветнай вайны на беларускі нацыянальны рух і працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці / А.А. Райчонак // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальных і міждзяржаўных адносін: зборнік навуковых артыкулаў / Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель, 2012. – Вып. 1. – С. 268–273.
20. Рудовіч, С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 г. / С. Рудовіч. Ін-т гісторыі Нац. Акад. навук Беларусі – Мн. : НВК "Тэхналогія", 2001. – 200 с.
21. Сильванович, С.А. Польское национальное движение на белорусско-литоских землях в 1918–1919 гг. / С.А. Сильванович // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальных і міждзяржаўных адносін: зборнік навуковых артыкулаў / Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель, 2012. – Вып. 1. – С. 282–288.
22. Смалянчук, А.Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй: Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864–1917 / А.Ф. Смалянчук. – Гродна, 2001. – 320 с.; Смалянчук, А. Новыя ацэнкі польска-літоўскіх адносінаў у літоўскай гістарыяграфіі 90-х гг. 20 ст. / А. Смалянчук // Гіст. Альманах. – Т. 4. – 2001. – С. 64–69.
23. Стрелец, М.В. Средняя Литва как проблемный комплекс в международных отношениях 1920–1939 гг. / М.В. Стрелец // Осень 1939 года: коренной перелом в судьбе белорусского народа / редакторы: Н.Н. Ковалёва [и др.]. – Брест : БрГТУ, 2009. – С. 185–191.
24. Талкачоў, В. Цяжкі студзень 1919. Да пытання аб стварэнні Літоўска-Беларускай ССР / В. Талкачоў / Беларуская думка. – 1994. – № 1. – С. 67–69; Талкачоў, В.І. Стварэнне Літоўска-Беларускай ССР: новыя падыходы і асэнсаванне / В.І. Талкачоў // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка. – 2003. – № 1. – С. 210–218.
25. Ціхаміраў, А. Беларуска-літоўскія дачыненні ў 1914–1920 гг. / А. Ціхаміраў // Спадчына. – 2000. – № 5–6. – С. 3–27; Ціхаміраў, А. Мірны дагавор паміж Літвой і РСФСР 1920 г. / А. Ціхаміраў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 5. – С. 206–207; Ціхаміраў, А. "Віленскае пытанне" ў міжнародных адносінах 1918–1920 гг. / А. Ціхаміраў // Белорусский журнал международного права и международных от-



Репозиторий БГУ

ношений. – 2002. – № 3. – С. 37–45; Ціхаміраў, А.В. Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921 гг.) / А.В. Ціхаміраў. – Мн. : Экаперспектыва, 2003. – 399 с.

26. Цобкала, А. Нацыянальны рух у гады Першай сусветнай вайны (1915 – пачатак 1917) / А. Цобкала // Пытанні гісторыі і методыкі выкладання. Зб. навуковых арт. – Мн., 1998. – Вып. 1. – С. 98–104.

27. Цуба, М.В. Нацыянальна-культурная і дабрачынная дзейнасць Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (1915–1917 гг.) / М.В. Цуба // Вестник Полесского государственного университета. Серия общественных и гуманитарных наук. – 2012. – № 2. – С. 21–30; Цуба, М.В. Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенны бакі) 1914–1918 гг. / М.В. Цуба. – Пінск : ПалесДУ, 2010. – 303 с.

28. Хомич, С.Н. Территория и государственные границы Беларуси в XX веке: от незавершённой этнической самоиндентификации и внешнеполитическогопроизвола к современному status quo / С.Н. Хомич. – Мн. : Экономпресс, 2011. – 415 с.

29. Чарнякевіч, А. Сярэдняя Літва / А. Чарнякевіч // Беларуская энцыклапедыя. – Мн., 2002. – Т. 15. – С. 362–363.

30. Щавлинский, Н.Б. Белорусское национальное движение в годы Первой мировой войны / Н.Б. Щавлинский. – Мн. : РИВШ, 2001. – 136 с.; Щавлинский, Н.Б. Белорусское национальное движение в годы Первой мировой войны (1914–1918 гг.) : автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02 / Н.Б. Щавлинский. – Мн, 2000. – 21 с.

## ЗАХАВАННЕ ТРОХ ПАЎНОЧНЫХ ПАВЕТАЎ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў СКЛАДЗЕ РСФСР У 1924 г.

***А.В. Бараноўскі (Мінск)***

Віцебкая губерня з’яўлялася месцам кампактнага пражывання беларускага насельніцтва. У студзені 1919 г. Віцебшчына ўваходзіла ў склад ССРБ. Аднак неспрыяльныя знешнепалітычныя абставіны і прычыны эканамічнага характару прывялі да перадачы губерні ў склад РСФСР. Пасля перадачы і да прыняцця рашэння аб ўз’яднанні тэрыторыі Віцебскай губерні з БССР, кіраўніцтва Беларускай рэспублікі і мясцовая грамадскасць ставіла перад партыйнымі і савецкімі органамі СССР і РСФСР пытанне аб вяртанні ўсходнебеларускіх тэрыторый. Напрыканцы 1923 г. быў прыняты шэраг рашэнняў аб перадачы тэрыторыі Віцебскай губерні ў склад БССР.

Палітбюро ЦК РКП(б) 29 лістапада 1923 г. на сваім пасяджэнні зацвердзіла прапанову камісіі Аргбюро ЦК РКП(б) аб змене межаў Беларускай рэспублікі. Згодна з ёй, тэрыторыя Віцебскай губерні цалкам вярталася ў склад БССР. Прэзідыуму ЦВК СССР было прапанавана ў месячны тэрмін адпаведна аформіць пастанову Палітбюро ЦК РКП(б), удакладніўшы межы БССР [1].

На пасяджэнні Прэзідыума ЦВК СССР 7 снежня 1923 г была створана камісія па змене межаў паміж РСФСР і БССР. У яе склад увайшлі: ад РСФСР – Ц. Сапронаў і А. Смірноў, ад БССР – В. Багуцкі і М. Мароз, ад УССР – Ф. Кон. Старшынёй камісіі быў прызначаны А. Енукідзэ [2].